# ВОДЗЫЎ
на аўтарэферат
Алесі Анатольеўны НОСІК
"Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове:
структура, семантыка, функцыянаванне",
прадстаўленай да абароны на атрыманне
вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
на спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Аўтарэферат Алесі Анатольеўны Носік "Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне" дае выразнае прадстаўленне аб структуры і змесце дысертацыйнага даследавання. Аўтарам асвятляюцца найбольш важныя пытанні асаблівасцей семантыкі і сфер функцыянавання лексічных адзінак, якія служаць для апісання эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове.

Выбраная тэма даследавання з'яўляецца актуальнай, паколькі распрацоўваецца ў рэчышчы распаўсюджанага ў цяперашні час антрапацэнтрычнага кірунку ў мовазнаўстве. Фармуліроўка мэты і задач работы адлюстроўвае заяўлены дыяпазон закранутых пытанняў.

Аўтарэферат змяшчае неабходныя структурныя элементы і адпавядае паслядоўнай і лагічнай кампазіцыйнай будове дысертацыі. У першай главе даследчыкам акрэсліваюцца найбольш актуальныя псіхалагічныя аспекты эмоцый і прыводзяцца падыходы да іх вывучэння ў лінгвістычнай навуцы. У аналітычнай частцы дысертацыі аўтар прадстаўляе комплексны агляд поглядаў на складаную сутнасць эмоцыі, яе выключную фізіялагічную і псіхалагічную значнасць для нармальнага існавання чалавека. Прыводзіцца тэзіс аб універсальнасці базавых эмоцый і іх магчымых нацыянальна-культурных варыяцыях, што знаходзіць сваё адлюстраванне ў лінгвістыцы эмоцый. Аўтар акцэнтуе ўвагу на розных падыходах да класіфікацыі эмоцый, крытэрыях размежавання і асноўных уласцівасцях эмацыянальных з'яў. У якасці аднаго з важных кампанентаў эмацыянальнага жыцця чалавека ўзгадваецца сістэма сродкаў невербальнага выражэння эмоцый (фізічных, мімічных, жэставых, альфакторных, візуальных і інш.) і абгрунтоўваецца мэтазгоднасць іх уключэння ў кантынуум эмацыянальных намінацый. Аналізуюцца даследаванні моўных рэпрэзентантаў эмоцый у супастаўляльным і дыяхранічным аспектах, дэманструецца спецыфіка функцыянавання эмацыянальных найменняў у мастацкім дыскурсе.

У другой главе разглядаюцца намінацыі адмоўных эмоцый з інварыянтнымі значэннямі гора, гневу, агіды, пагарды, нянавісці, віны, сораму і страху, якія Алеся Анатольеўна прадстаўляе ў выглядзе лексіка-семантычных палёў. Унутраная рубрыкацыя такіх аб'яднанняў асноўваецца на паслядоўным вылучэнні субстантыўнай, ад'ектыўнай і дзеяслоўнай груп

пяршасных найменняў эмоцый. Прыводзяцца прыклады лексем з функцыянальна-стылістычнай паметай "размоўнае", а таксама ўказваюцца асноўныя напрамкі семантычнай дэрывацыі і зафіксаваных другасных метафарычных лексіка-семантычных варыянтаў.

Трэцяя глава адлюстроўвае лексічныя сродкі намінацыі станоўчых эмоцый, да ліку якіх даследчыца аднесла радасць, цікавасць і здзіўленне, падкрэсліўшы пры гэтым дваістую прыроду апошняй. Аўтар канстатуе відавочную перавагу адмоўных эмоцый над станоўчымі і растлумачвае дадзены факт тым, што станоўчым эмоцыям уласціва шырокая семантыка лексічных адзінак, іх сінкрэтычны характар і магчымасць спалучаць некалькі станоўчых эмоцый адначасова.

Атрыманыя вынікі з'яўляюцца пацвярджэннем таму, што мэта дысертацыі дасягнута аўтарам у поўнай меры, пра што таксама сведчыць заключэнне работы.

Хацелася б звярнуць увагу і на наяўнасць дадаткаў у дысертацыйным даследаванні. Як адзначаецца ў аўтарэфераце, іх колькасць складае 102 старонкі.

Дысертацыя Алесі Анатольеўны Носік з'яўляецца самастойным, завершаным навуковым даследаваннем, якое вылучаецца навуковай навізной, відавочнай тэарэтычнай і практычнай значнасцю, у поўнай ступені фарміруе далейшыя перспектывы для навуковых распрацовак па катэгорыі эмацыянальнасці ў розных мовах.

Як сведчаць матэрыялы аўтарэферата, дысертацыя "Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне" адпавядае патрабаванням ВАК, а яе аўтар – Алеся Анатольеўна Носік – заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

Прарэктар па навуковай рабоце
УА «Мінскі дзяржаўны
лінгвістычны ўніверсітэт»,
доктар філалагічных навук, дацэнт В.У.Лушчынская

Учреждение образования
"МИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ
ЛИНГВИСТИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ"
Подпись О.В.Лушчынскае
УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник отдела кадров МГЛУ
Г.Н.Кузьмич
06 2024

Рэспубліка Беларусь
Установа адукацыі
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»
г. Мінск